**КВЕСТ “Загадкі з лесніковай пасады”,**
**па паэме Якуба Коласа “Новая зямля”**

**В. Г.Шантарэнка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі
**А. К. Камянкова,**
настаўнік матэматыкі першай катэгорыі
СШ № 16 г. Полацка

**Мэта:** пашырыць веды вучняў пра літаратуру, культуру Беларусі праз класічны твор беларускай літаратуры Якуба Коласа “Новая зямля”.

**Задачы:** развіваць у вучняў цікавасць да вывучэння літаратуры, мовы, этнаграфіі, выхоўваць любоў і павагу да ўсяго роднага, беларускага, далучаць падрастаючае пакаленне да духоўнай спадчыны і самабытнай культуры нашага народа.

**Эпіграф:** Паэма “Новая зямля” – выдатны эпічны твор, які прыраўноўваецца да народнага эпасу, яго называюць энцыклапедыяй народа пэўнага гістарычнага часу –канца XIX стагоддзя.

М.Лынькоў

**Умовы квесту:** Удзельнікі гульні атрымліваюць маршрутныя лісты з аднолькавымі заданнямі. План маршруту распрацаваны так, што каманды ідуць адна за адной і не перасякаюцца на станцыях. Наведаць трэба 8 станцый, заданні якіх даюць магчымасць зацікавіць творам Якуба Коласа “Новая зямля”, апынуцца ў 19 ст., адчуць атмасферу таго часу, далучыцца да духоўнай культурнай спадчыны беларускага народа, паспрабаваць свае сілы ў веданні зместу твора.

На кожнай станцыі прадстаўнікі аргкамітэта гульні прапануюць камандам заданні, па выніках работы каманды атрымаюць балы ў табліцу і сімвал беларускага арнаменту.

**Абсталяванне:** Маршрутныя лісты, каляндар (на рускай мове), таблічкі з назвамі месяцаў на беларускай мове, раздаткі “Народныя святы”, карткі “Смачна есці”, запіс песняў на словы Якуба Коласа.

**І. Падрыхтоўчы этап.** Распрацоўка палажэння гульні, фарміраванне каманд, вызначэнне адказных на стацыях.

**II. Арганізацыйны этап.**

Камандам прапануюцца маршрутныя лісты.

**III. Правядзенне квэсту.**

**Станцыя 1. “Знаёмства”.** Вучням трэба назваць твор, знайсці аўтара (гаспадара леснічоўкі), дзе адбываецца квест. (Дадатак 1).

**Станцыя 2. “Падворак”**

На прыгуменні, поруч з садам,
Павець з гумном стаяла радам,
А пад паветкаю прылады:
Вазок, калёсы, панарады,
Старыя сані, восі, колы
І вулляў некалькі на пчолы…

Удзельнікам гульні прапануецца суаднесці назвы пабудоў і прылад працы селяніна 19 стагоддзя з фотаздамкамі.

1) Адрына (карцінка нумар 5);
2) Пуня ( карцінка нумар 4);
3) Плуг (карцінка нумар 2);
4) Бароны (карцінка нумар 1);
5) Паветка ( карцінка нумар 3).

**Станцыя 3. “У хаце”**

Дзень быў святы. Яшчэ ад рання
Блінцы пякліся на сняданне,
І ўжо пры печы з чапялою
Стаяла маці…Пад рукою
Таўкліся дзеці, заміналі,
Або смяяліся, спявалі.
Услон заняў сваё ўжо месца,
На ім стаяла дзежка цеста,
І апалонік то і дзела
Па дзежцы боўтаў жвава, смела
І кідаў цеста ў скавародкі…

Удзельнікі выконваюць заданні з выкарыстаннем школьнай экспазіцыі “Повязь часаў”. (Дадатак 2)

1) Знайдзіце посуд для прыгатавання верашчакі і блінцоў. (Фотаздымкі з экспазіцыі знаходзяцца на прэзентацыі).

2) Аднавіце паслядоўнасць прыгатавання беларускіх страў (паслядоўнасць прыгатавання пераблытаная на прэзентацыі).

3) Знайдзіце лішняе ў кожным радзе.

**Станцыя 4. "З густам па-беларуску"**

А для гасцей, святой нядзелькі
Надзелі новыя камзэлькі,
А боты так нашмальцавалі,
Што проста шляхту касавалі.

На станцыі знаходзіцца сапраўдны куфар, у якім ляжыць вопратка, яе трэба падзяліць на мужчынскую і жаночую, назваць рэчы па-беларуску. (Падказка знаходзіцца на куфары ў выглядзе лялек у нацыянальных касцюмах і ў слоўніку на прэзентацыі. Дадатак 3 ).

**Станцыя 5. "Свята ў хаце**

І ўжо пад вечар сама хата
Была прылучана да свята:
Лагоднасць, згода і павага
І вельмі сталая развага
Ўвесь гэты дзень тут панавалі
І блізкасць свята шанавалі.

У паэме "Новая зямля"Якуба Коласа адлюстраваны ўсе поры года, святы, звязаныя з беларускім народным календаром, вучням прапануецца перакласці назвы месяцаў на беларускую мову, суаднесці іх з народнымі святамі беларусаў.(Дадатак 5)

**Станцыя 6. "Музычная"**

- А пасядзеце, пагуляйце,
Павесяліцесь, паспявайце.
- Ну, песню, песню! Пачынайце!
-

Удзельнікі спаборнічаюць у веданні твораў класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа , пакладзеных на музыку.

Гульцам трэба вызначыць: тэкставая аснова якіх песень належыць Якубу Коласу. (Дадатак 7)

- Мой родны кут, як ты мне мілы… (+)
- Песня аб вясне (+)
- Ручэй (+)

- “Спадчына” (-)
- “Зорка Венера” (-)

**<u>Станцыя 7.  “Магічныя лічбы”</u>**

-Ну, усе выгоды каля бока,
Тае ж зямлі якраз валока,
Міхал распісваў з жарам далей:
А чорны грунт – дванаццаць цалей!

Гэтая станцыя дае магчымасць вызначаць: наколькі вучні арыентуюцца ў адзінках вымярэння нашых продкаў.

**<u>Станцыя 8.  “Пасланне для нашчадкаў”</u>**

Каманды на кожнай станцыі атрымалі сімвал-узор беларускага арнаменту. З прапанаваных сімвалаў трэба пабудаваць сказ-пажаданне для нашчадкаў.(Дадатак 6)

**<u>IV. Падвядзенне вынікаў.</u>**
Узнагароджанне каманд.

**Дадатак 1.** Знайсці гаспадара леснічоўкі і ўзгадаць назву твора.










**Дадатак 2.**

Экспазіцыя “Повязь часоў”



**Дадатак 3.**Станцыя “З густам па-беларуску”.
















**Дадатак 5.** “Святы”







**Дадатак 6.** “Пасланне да нашчадкаў”

# АЗБУКА БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТУ

SYMBAL BY



**Дадатак 7**. Станцыя музычная



Слоўнік да гульні



# Якуб Колас

*МУЗЕЙ У АКІНЧЫЦАХ*

*ЯКУБА КОЛАСА*







# 1 СТАНЦЫЯ




ХЛЕБ-СОЛЬ
люлька
колыбель
стол
стол

# 2 СТАНЦЫЯ

1)ГУМНО
2)АБАРОГ
3)ПЛУГ
4)БАРАНА
5)ПАВЕТКА
















# 3 СТАНЦЫЯ


фіранкі
занавески
абраз
икона
ручнік
рушник
люлька
колыбель
посцілка
покрывало
ложак
кровать
накрыўка
покрывало
услон
лавка
уціркa
полотенце
дежа






МАСЛЕНІЦА

Лубка



Млынок



# *Знайдзі лішняе слова*

1. Узвар, жэрандоля , дранікі, мачанка, зацірка;
2. Гарбата, наліснікі, суп, салата, сякера
3. Чай, клёцкі, халаднік, лядоўня, хлеб;
4. Жур, грачанікі, боршч, печыва, чапяла;
5. Луста, акраец, скіба, гарбушка.



**<u>Аднаві рэцэпт тоўстых бліноў у пэўнай паслядоўнасці:</u>**

А. Цеста вытрымаць у цяпле паўгадзіны.
Б. Нагрэць сыроватку (40 С°).
В. Дадаць 1 лыжачку соды, 3-4 шклянкі мукі, алею 3 лыжкі, соль па смаку.
Г. Есці з мачанкаю, варэннем, смятанаю.
Д. Пячы бліны пад вечкам.




**<u>Аднаві рэцэпт верашчакі ў пэўнай паслядоўнасці</u>**

А. Падкласці ў падкалоту каўбасу і рабрынкі, дадаць перца.
Б. Парэзаць каўбасу, абсмажыць разам з рабрынай.
В. Дадаць лаўровы ліст, патушыць і настаяць, падаваць с блінамі, бульбай, хлебам.
Г. Варыць 40 хвілін сялянскую каўбасу (300г), свіныя рэбры (300 г), дадаць соль па смаку, не выліваць юшку.
Д. Зрабіць падкалоту: муку злёгку разбавіць вадой, уліць сумесь у юшку (на 1 літр юшкі - 2-3 ст.л. мукі).

# 4 СТАНЦЫЯ

## Жанчына



Спадніца



Андарак



Намітка



Безрукаўка



Фарту́х



Шкарпэткі



Шнуроўка



Саян



Панёва



Армяк



## Мужчына



Паяс



Рамень



Штаны



Ла́пці



Кашуля



Бурка



Паддзёўка



Камізэлька



Нагавіцы



Брыль



# 5 СТАНЦЫЯ




Каляды

Гуканне вясны

Дажынкі

Купалле

# 6 СТАНЦЫЯ МУЗЫЧНАЯ



**Мой родны кут**



**Спадчына**



**Песня аб вясне**





**Зорка Венера**



**Ручэй**

# 7 СТАНЦЫЯ   ЧАРОЎНЫЯ ЛІЧБЫ

- Ну, усе выгоды каля бока,
Тае ж зямлі якраз валока,
Міхал распісваў з жарам далей:
А чорны грунт - дванаццаць цалей!
Якая таўшчыня грунта і колькі зямлі меў
на ўвазе герой паэмы “Новая зямля”?



# Мера збожжа ў 60 снапоў





Якое народнае свята адзначаецца  ў канцы сёмага тыдня пасля Вялікдня. У яго назве таксама ёсць лічба.





# Якое  народнае свята пачынаецца з 14 сакавіка?





Слоў мяшок, а спраў вяршок.

Вяршок – гэта колькі?





# 8 СТАНЦЫЯ


АЗБУКА БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТУ
SYMBAL BY
АГОНЬ
БАГАЦЦЕ
ВЯСНА
ДУША
ЖЫЦЦЁ
ЗЯМЛЯ
КРАСА
МАЛАДОСЦЬ
НАСЕННЕ
ПРОДКІ
РОСКВІТ
СОНЦА
СЯМ'Я
УРАДЖАЙ
ЧЫСЦІНЯ
ЭНЕРГІЯ









# *Дзякуй за ўвагу!*








| ЛЕСНІКОВА ПАСАДА | | |
|---|---|---|
|  | Сядзіба— жылыя і гаспадарчыя пабудовы разам з садам, агародам, якія складаюць адну гаспадарку. | А дзе прыгожыя загібы<br>Так міла йшлі каля сядзібы,<br>Што проста імі б любаваўся. |
|  | Шаты— покрыва (звычайна з лісця, травы). | А знізу гэты лес кашлаты<br>Меў зелянюсенькія шаты |
|  | Краска – палявая кветка. | З прыемным спевам чарадою,<br>Зашэпчуць краскі між сабою,<br>Нібы дзяўчаткі маладыя. |
|  | Павець— пляцоўка пад страхой на слупах, прызначаная для хавання чаго-небудзь ад дажджу. | На прыгуменні, поруч з садам,<br>Павець з гумном стаяла радам… |
|  | Панарады –інструмент гаспадара. | А пад паветкаю прылады:<br>Вазок, калёсы, панарады… |
|  | Цабэрак— шырокая круглая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі. | Стары цабэрак, паўасміна<br>І розны хлам і лом валяўся, |

| | | |
|---|---|---|
|  | Гумно – вялікая халодная будыніна для складвання і абмалоту збожжа. | Гуменца, крытае саломай,<br>Ад доўгіх часаў пасівела… |
|  | Прыгрэбнік – прыбудоўка перад уваходам у пограб, склеп. | А збоку, ў полі, недалёка<br>Стаяў прыгрэбнік адзінока,<br>Пахілкам, горкім сіратою,<br>У дол упёршыся страхою. |
| **II. РАНІЦА Ў НЯДЗЕЛЬКУ** | | |
|  | Вілка—доўгая палка з двума металічнымі паўкруглымі рагамі на канцы, пры дапамозе якой ставяць у печ і вымаюць з яе гаршкі, чыгункі і пад. | Тым часам маці даставала.<br>Чыгунчык з печы, лыжку брала.<br>І верашчаку налівала. |
|  | Услон— пераносная лаўка на ножках у сялянскай хаце. | Услон заняў сваё ўжо места,<br>На ім стаяла дзежка цеста, |
|  | Дзежка— драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна з прамых клёпак для заквашвання цеста. | |
|  | Апалонік— вялікая лыжка, якой разліваюць страву. | І апалонік то і дзела<br>Па дзежцы боўтаў жвава, смела |

| | | |
|---|---|---|
|  | Патэльня— тое, што і скаварада. | І кідаў цеста ў скавародкі.<br>Давала піск яно кароткі,<br>Льючыся з шумам на патэльні,<br>І ў жар стаўлялася пякельны; |
|  | Здор— нутраное свіное сала. | А дзеці іх даўно сачылі<br>І на ляту блінцы лавілі,<br>Заядла мазалі іх здорам. |
|  | Верашчака— мучная страва з мясам, каўбасой і рознымі прыправамі. | Стаяў асобна ў місцы скорам<br>Сяго-таго для верашчакі. |
|  | Прыпек –выемка для вуголля, попелу ў печы. | І звон аб прыпек скавародны,<br>Так блізкі сэрцу, так ім родны, |
| **III. ЗА СТАЛОМ** | | |
|  | Мачанка— страва з сала, мяса і каўбасы, падкалочаная мукой. | Цягні мачанку, маці, з печы! |
|  | Камзэлька— кароткая адзежына без рукавоў і каўняра, якую надзяваюць на сарочку або блузку. | І бацька кідае відэльцы,<br>Рукою гладзіць па камзэльцы… |

| | | |
|---|---|---|
|  | Капа— куча сена, саломы, складзеная конусам; невялікі стажок. | І надта родзіцца капуста:<br>З вядро галоўкі вырастаюць,<br>З трох коп кадушку накладаюць! |
|  | Валока— былая мера зямлі (прыблізна 21 га). | Тае ж зямлі якраз валока, —<br>Міхал распісваў з жарам далей: —<br>А чорны грунт — дванаццаць цалей! |
|  | Цаля— мера даўжыні, роўная 2,54 см. | |
|  | Зэдлік— невялікая лава; услончык. | На зэдлі Ўладзік схісянуўся,<br>Алесю хітранька ўсміхнуўся. |
|  | Карыта— прадаўгаватая пасудзіна, выдзеўбаная з дрэва або збітая з дошак, якая скарыстоўваецца звычайна для кармлення жывёлы | Калі сядзець ты будзеш дома<br>Каля свайго збана, карыта, —<br>Сказаў Міхал крыху сярдзіта, —<br>Сама зямля не прыйдзе, чуеш.. |
| **IV. НА ПЕРШАЙ ГАСПАДАРЦЫ** | | |
|  | Пляц – зямля пад сядзібай, сядзіба. | У нас ужо ёсць сёе-тое:<br>Ну, пляц, зямлі на чвэрць надзела… |

| | | |
|---|---|---|
|  | Шула— слуп ці брус, на які падвешваецца створка варот. | Іх маці зараз падабрала,<br>Нічога сыну не сказала, Пайшла ў крыніцы спаласнула, Сушыцца ўскінула на шула. |
|  | Гуж— скураная ці вераўчаная пятля, пры дапамозе якой хамут злучаюць з дугой і аглоблямі. | Ляснічы так казаў, бывала:<br>— Што ж? добры конь і цягне дужа!<br>І не пускаў Міхала з гужа. |
|  | Шарак –неўзараны надзел зямлі. | Ляжаў шарак, бо там ніколі<br>Саха зямлі не бараздзіла. |
|  | Нарог – частка плуга, якая падразае зямлю знізу. | Тым часам з дому для падмогі,<br>Саху забраўшы і нарогі,<br>Антось прыехаў… |
|  | Морг – старая зямельная мера (0,71 гектара). | Узняў маргоў са два папару.<br>І ажывіліся амшары… |
|  | Амшары— мохавае балота. | |
|  | Ралля – узаранае поле, узараная глеба. | Свой пэўны кут, свая ралля:<br>То — наймацнейшая аснова. І жыцця першая умова. |

| | | |
|---|---|---|
|  | Надоба – розныя рэчы, патрэбныя ў надзённым жыцці. | У тым кутку, глухім і дзікім,<br>Стараннем дзядзькавым вялікім<br>І цяжкай працай хлебароба<br>Набыта розная надоба… |
|  | Збан— высокая гліняная пасудзіна, якая звужаецца ўверсе і мае звычайна ручку і носік. | А цэлы рад збаноў на плоце<br>Казаў аб тым, што гаспадыня<br>Была ўжо ў моцнай каляіне |
| **V. ПЯРЭБАРЫ** | | |
|  | Цапстрыкі— дробныя рэчы дамашняга скарбу. | Збірай зноў цапстрыкі, трасіся<br>Па каранях з дабром, з сям'ёю… |
|  | Падводы – запрэжаны воз, калёсы. | На трэці дзень прыйшлі падводы.<br>Ўсе сваякі папрыязджалі<br>І двор вазамі паўстаўлялі… |
|  | Пярэбары— пераезд, перасяленне. | На тое час быў перабору.<br>Была адчынена камора.<br>І сені насцеж. Як папала… |
|  | Варстат— спецыяльна абсталяваны стол для сталярнай, слясарнай і інш. работы. | Варстат, на часткі разабраны,<br>На трэскі кінуты, валяўся… |

| | | |
|---|---|---|
|  | Качарга— жалезны прут, сагнуты на канцы, для перамешвання паліва ў печы. | Качэргі, вілы і лапата<br>Ў кутку адным цяпер стаялі… |
|  | Восі— шпень або тонкі вал, на які насаджваюцца колы. | А пад паветкаю прылады:<br>Вазок, калёсы, панарады,<br>Старыя сані, восі, косы. |
|  | Крысо— ніжняя частка якой-н. адзежыны, палавіны якой спераду расхінаюцца; пала. | Антось пляменніцу ўцяшае.<br>І нос крысом ёй абцірае |
|  | Студня— вузкая глыбокая яма, звычайна ўмацаваная ад абвалаў зрубам, для здабывання вады з ваданосных слаёў зямлі. | Ды студні вочап адзінока<br>Тырчаў над хатаю высока… |
|  | Вочап— шост, да якога прымацоўваецца калодзежнае вядро. | |
| **VI. КАЛЯ ЗЯМЛЯНКІ** | | |
|  | Зямлянка— часовае жыллё, зробленае ў зямлі (іншы раз выступае на паверхню). | З'явілась новая будова —<br>Зямлянка-будачка малая<br>Ў адно акенечка, крывая… |
|  | Хлеў – памяшканне для свойскай жывёлы, птушак. | Загнаўшы ў хлеў на месца статка,<br>Насеўся Ўладзя на аладкі… |

| | | |
|---|---|---|
|  | Варыўня— невялікі будынак для захавання бульбы, агародніны. | Ды йзноў бяда: праз год вясною<br>Згарэла хата з варыўнёю… |
|  | Скрыня – драўляная пасудзіна з вечкам і замком для захоўвання рэчаў, каштоўнасцей; куфар. | Ў агні згарэла яе скрыня<br>З усім пасагам і набыткам;<br>Прапалі хусты яе, світка,<br>Згарэлі кросны, рад багоў<br>І грошай сорак сем рублёў. |
|  | Світка – доўгая сялянская верхняя вопратка з сукна. | |
|  | Кросны— ткацкі станок. | |
| **VII. ДЗЯДЗЬКА-КУХАР** | | |
|  | Поплаў – луг у пойме ракі. | Вось так гуртом яго абсядуць<br>І час работы яго крадуць;<br>Насі «катла», кажы ім казкі,<br>Ідзі на поплаў з імі ў краскі… |
|  | Купкі— памяншальная форма да купа; невялікая купа. | Лужкі, дарожкі, і пагоркі,<br>І купкі хвоек маладыя… |

| | | |
|---|---|---|
|  | Трацяк— трэцяя частка чаго-небудзь (ураджаю, сенакосу і пад.). | Тут сотні блізшага народу<br>Дзялянкі лесу карчавалі<br>І на трацяк іх засявалі —<br>Капу да скарбу, дзве дадому...<br>Ну, як тут вытрываць маломy… |
|  | Сяліба – населены пункт у сельскай мясцовасці (пасёлак, сяло і пад.). | О, дзядзька спосабаў меў многа<br>Даняць праціўніка малога!<br>Пайсці ў грыбы ці ў тую ж рыбу,<br>Або паехаць у сялібу… |
|  | Млын – прадпрыемства, будынак з устаноўленымі ў ім прыстасаваннямі для размолу зерня. | Пайсці ў грыбы ці ў тую ж рыбу,<br>Або паехаць у сялібу<br>Ці ў млын малоць на хлеб збажынку –<br>Ўсё гэта квапіла хлапчынку, |
|  | Паленца - кавалак распілаванага і рассечанага бервяна на паліва. | Агоньчык дзеці раскладалі,<br>Паленцы, трэсачкі збіралі… |
|  | Тарачка | - Алеська! скокні, брат, вазьмі ты<br>У хатцы тарачку на печы! |
|  | Галушка – круглы камяк, шарык, скачаны з чаго-небудзь мяккага. | Як дзядзька, цеста замяшаўшы,<br>Качаў галушкі, міску ўзяўшы… |
|  | Чыгунчык – гаршчок са сплаву жалеза з вугляродам. | Дык дзядзька зараз стаў пакрышку<br>Ў чыгунчык клёцкі кідаць з лыжкі… |

| | | |
|---|---|---|
|  | Аполак – крайняя дошка пры падоўжнай распілоўцы бервяна (выпуклая з аднаго боку). | Дастаў сякерку і свярдзёлак,<br>Пад паху сунуў ён аполак… |
|  | Свярдзёлак – невялікі свердзел, інструмент свідравання круглых адтулін у дрэве, метале. | |
|  | Збан паліваны - высокая гліняная пасудзіна, якая звужаецца ўверсе і мае звычайную ручку. | Відзён і збан быў паліваны,<br>Да палавіны ў дол ўкапаны,<br>Кружочкам шчыльненька накрыты. |
| **XIII. ПАДГЛЯД ПЧОЛ** | | |
|  | Куродым— густы едкі дым пры тленні, гарэнні без полымя. | Антось бярэ куродым, сіта,<br>Глядзіць на гэты рой сярдзіта… |
|  | Драбіны— драўляная прыстаўная лесвіца. | Палез Антось перш па драбінах,<br>З драбін цярэбіцца ў галінах. |
|  | Ночвы— прадаўгаватая драўляная або металічная пасудзіна для мыцця бялізны і іншых гаспадарчых патрэб. | У ночвах голавы памылі,<br>І вусы спрытна падкруцілі, |

| | | |
|---|---|---|
|  | Цэп— ручная драўляная прылада для малацьбы збожжа, якая складаецца з цапільна і прымацаванага да яго гужыкам біча. | А на гваздзі ў таўшчэрным шуле<br>Цапы віселі, бы заснулі. |
|  | Торпы— вялікая сціртa снапоў або саломы, складзеная асобым спосабам для захоўвання пад адкрытым небам. | Міхал выразна замаўкае<br>І торпы вокам акідае. |
|  | Брама – шчыльныя, на дзве палавіны, крытыя зверху вароты. | Малыя з хаты высыпалі.<br>За брамай бацьку сустракалі. |
|  | Пасека – месца, дзе размешчаны вуллі з пчоламі і спецыяльныя будынкі. | Былі там пасекі.<br>Штогоду<br>Тут сотні блізшага народу<br>Дзялянкі лесу карчавалі … |